Мікола ТРУС,
кандыдат філалагічных навук

# "ТАКІМ Я ЯГО ПОМНЮ…": ЛІСТЫ З "ЗЯЛЁНАЙ ХАТКІ"

**Архіўныя матэрыялы да жыцця і творчасці Максіма Багдановіча.** Сшытак 5 / склад.: М. А. Бараноўскі, І. В. Мышкавец. – Мінск : СтройМедиаПроект, 2022. – 175 с.

Чарговае выданне Літаратурнага музея Максіма Багдановіча ў параўнанні з папярэднімі істотна змяняе ракурс асэнсавання жыццяпісу класіка. У фокусе ўвагі знаходзяцца эпісталярная спадчына, мемуарныя запісы сучасніцы паэта і шляхі збору матэрыялу, асноўная мэта якога стварэнне дзвюх пастаянных экспазіцый у Мінску.

Зборнік прымеркаваны да 130-годзя з дня нараджэння Зоські Верас (1892–1991), паплечніцы песняра чыстай красы, актыўнай удзельніцы беларускага грамадска-культурнага руху пачатку XX ст. Вядома, гэтым гістарычным прамежкам не абмяжоўваецца нацыянальная чыннасць працяглага жыцця шаноўнай адрасанткі. Гаворка ідзе пра "Пяць месяцаў у Мінску: З жыцця Максіма Багдановіча", менавіта пад такой назвай быў апублікаваны артыкул у газеце "Літаратура і мастацтва" ад 29 верасня 1967 г. (Пад гэтымі і іншымі мемуарнымі зацемкамі канца 1960 – пачатку 1980-х гг. прозвішча аўтара пазначана як Л. Войцікава.)

Каляжанку М. Багдановіч ведаў выключна пад іменем Людвіка Сівіцкая. Ад 1926 г. яна займела прозвішча Войцік (па другім мужу), якім і падпісаны лісты з "зялёнай хаткі", што знаходзілася на ўскраіне Вільні і стала своеасаблівай Меккай для многіх даследчыкаў мінуўшчыны. Адрасантка тлумачыла (тут і далей захоўваецца правапіс арыгіналаў): «*Псэуданім "Зоська Верас" прыняла толькі у 1918 г., калі у "Вольнай Беларусі" быў надрукаваны мой маленькі "абразок" – калі так можна назваць – "Нёману". І абразок гэты напісаны экспромтам і псэуданім паўстаў у даволі арыгінальных абставінах проста у рэдакцыі "Вольнай Беларусі"*». Скардзілася пры гэтым на змушаны клопат: "*А цяпер аніяк ня магу дабіцца, каб псэуданіму ня ужывалі там дзе яго і быць не магло*" (с. 97).

Гэтая акалічнасць карэктна ўлічана ў новым эпісталярным выданні (акрамя складальнікаў, над ім працавалі Ж. Антусевіч, В. Кароткіна, А. Кніга), засведчана ў анатацыі, прадмове; таксама "было прынята рашэнне захаваць правапіс лістоў Л. А. Сівіцкай-Войцік, што вызначаецца стылістычнымі і моўнымі асаблівасцямі, адлюстроўвае моўную атмасферу, у якой жыў і тварыў М. Багдановіч у мінскі перыяд. Пунктуацыя падаецца паводле сучаснай нормы, але таксама з захаваннем асаблівасцяў аўтарскай манеры Людвікі Антонаўны (актыўнае выкарыстанне працяжнікаў, шматкроп'яў, пытальнікаў)" (с. 4–5). (Ад сябе адзначым захаванасць аўтэнтычнага напісання з вялікай літары асабовых займеннікаў і некаторых назоўнікаў паўсюдна, а не толькі ў дачыненні да асобы паэта.)

Лісты (усяго 85 адзінак музейнага значэння), датаваныя 1969–1988 гг., адрасаваны Юліі Бібіле, Міхасю Пазнякову, Валянціне Бяляўскай, Алесю Бачылу, Ніне Ватацы, Генадзю Каханоўскаму, Анатолю Наліваеву, Вячаславу Шыдлоўскаму, Уладзіміру Содалю і інш. У іх згадваецца сталае супрацоўніцтва з шэрагам рупліўцаў беларускай культуры: Генадзем Кісялёвым, Арсенам Лісам, Алегам Лойкам, Янкам Саламевічам, Алесем Белакозам, Сяргеем Панізнікам і інш.

З 1981 г., калі было прынята рашэнне аб стварэнні Літаратурнага музея Максіма Багдановіча, ліставанне асабліва пільна факусавала ўвагу на жыцці і творчасці паэта ў мінскі перыяд. Сабраны ў зборніку эпісталярый, нягледзячы на рознасць адрасатаў, стварае ўражанне тэксталагічнай цэльнасці. Узноўленая Л. Сівіцкай факталогія становіцца свайго роду вандроўнымі сюжэтамі: паўтараецца, пастаянна ўдакладняецца, варыятыўна акцэнтуецца, парознаму суправаджаецца эмацыйна. Таму пры цытаванні мы дазволілі сабе не называць адрасатаў і не ўказваць час напісання карэспандэнцыі, а толькі фіксаваць старонку ў агульным тэкставым масіве.

### У ЗАСЕНІ ДАГЛЕДЖАНАГА САДУ

Гаспадыня "лясной хаткі", як яна сама называла сваё віленскае жытло, стала ўнікальнай крыніцай інфармацыі для даследчыкаў. На дзіва ўчэпістая памяць і надзвычайная скрупулёзнасць у дачыненні да дэталяў былі асабліва каштоўнымі на падрыхтоўчых этапах стварэння экспазіцый двух музеяў паэта ў Мінску. Асабліва "Беларускай хаткі", адзінай мемарыяльнай пабудовы, дзе сапраўды жыў паэт, названай

**Гаспадыня “зялёнай хаткі” разам з гасцямі: Валянціна Бляўская, Людвіка Войцік (Зоська Верас), Ніна Ватацы, Ніна Ляшковіч.** 1982 г.

у знак сімвалічнай пераемнасці з аднайменным клубам беларускай інтэлігенцыі, што знаходзіўся на былой вуліцы Захар’еўскай, 18.

Некаторыя пытанні пашыраліся і на яраслаўскі побыт паэта. Адказ не толькі быў адмоўны, ён сведчыў пры жыццёвыя кантрасты і душэўную неўладкаванасць: «*Што да мэбляў і выгляду пакою Максіма, я абсалютна нічога ня ведаю. Ён <u>ніколі</u> ні адным словам не ўспамінаў аб сваім жыцьці у дома, апрача таго, што жыў “у чужым” асяроддзі. Бо і сапраўды для Яго там ўсё было чужое, ня спрыяючае ані Яго душы, ані Яго таленту*» (с. 21). Пра стан паэта ў Мінску напісана надзвычай натхнёна: «*І цяпер успамінаю Яго часта, як Чалавека надзвычай сціплага, для ўсіх дабразычлівага, прыязнага, выключна справядлівага. Але і вельмі нэрвовага, гарачага… Мы ўсе так стараліся нічым не нэрваваць… Нічым ня ўспамінаць, што Ён хворы, бо вельмі гэтага ня любіў… Стараўся быць – “як усе”*» (с. 143). Паэт чыстай красы прыгаданы ў розных месцах і пры адметных нагодах: у “Беларускай хатцы” (клубе нацыянальных інтэлектуалаў часоў Першай сусветнай вайны), на “суботніках” – сустрэчах пісьменнікаў і грамадска-культурных дзеячаў, у дзіцячых прытулках у Карпілаўцы і Ратамцы, інш.

Для аўтара гэтых радкоў, былога супрацоўніка “Беларускай хаткі” і Літаратурнага музея Максіма Багдановіча, напісанне артыкула стала нагодай звярнуцца да калег-папярэднікаў, пацікавіцца некаторымі жыццёвінкамі наведвання “зялёнай хаткі”. Валянціна Бляўская, галоўны захавальнік фондаў, згадала даўні маршрут: да ўскраіны Вільні дабіраліся на тралейбусе, потым пешшу лесам, пасля пад’ём на гару. Аўтарка “Беларуска-польска-расейска-лацінскага батанічнага слоўніка” (1924) заставалася вернай абранаму аднойчы напрамку практычнай дзейнасці – фларыстыцы, лекавым раслінам (“зялёнай аптэцы”). У сезон усё патанала ў кветках, якімі гаспадыня шчодра адорвала візіцёраў. Госця з Мінска атрымала ў падарунак галінку “дзекабрыста”. Валянціне Францаўне добра запомнілася тое, што асабліва здзівіла ў адасобленым жыцці “хаткі”: калодзежа не было, збіралася дажджавая вада і для кветак, і для ўсіх побытавых патрэб. Лявон Луцкевіч, зяць Зоські Верас, рупіўся пра гэтую сістэму водазберагання. Гаспадыня прыгадвала: «*Некаліcь П. Сергіевіч, які даволі часта прыходзіў да нас, казаў: “вось бы дзе жыць мастаку! Кожны дзень нешта мяняецца: паўстаюць новыя фарбы, новыя адценкі”. Але сам у нас намаляваў адзін абразок, малады яшчэ тады наш сад, па васеньняму чырванаватыя асінкі і над ўсім – вялікі дуб… І сяньня ён стаіць, толькі што сад ужо стары, яблыні вялікія…*» (с. 12).

Паводле згадак Паліны Сцепаненкі (Качатковай), бэз, прывезены ад Зоські Верас, спачатку рос у садзе на вуліцы Алтайскай у Мінску, сямейнай сядзібе Наталлі Мазоўкі. Восенню 1992 г. Паліна Качаткова і Эдуард Акулін выкапалі яго і пасадзілі каля адчыненай для наведвальнікаў



24/VI.1986.
Вільня.

Дарагія, паважаныя супрацоўнікі
Музея М. Багдановіча.

Дзякую за ліст.
Разумею Вас і рада буду прывітаць Вас у сябе.
Думаю, што гэта сама лепшы спосаб паразу-
мецца, бо [illegible]
[illegible] а так – асабіста. Выясьню што і
як.–
Найлепш будзе у пачатку ліпня...
[illegible] нешта [illegible] на [illegible]
– [illegible] – калі [illegible]...
Добра было б каб Вы загадзя павядомілі калі
прыедзеце – або пісьмом, або па тэлефону.
Нумар тэлефону – 449001. –
Але [illegible] мой зяць Лявон Ан-
тонавіч – а мой унук [illegible] Дзмітрыевіч –
і прыходзіць з работы позна, так што званіце
[illegible] у вечары...
Усяго добрага. і –
да пабачэння...
шчыра зычлівая Л. Войцік

**Ліст Людвікі Войцік да супрацоўнікаў Літаратурнага музея Максіма Багдановіча.** Вільня, 24 чэрвеня 1986 г.



**План кватэры дома Савы Рэдзькі ў Мінску, калі ў ёй жыў М. Багдановіч (цяпер музей "Беларуская хатка").** Малюнак Л. Войцік, дадатак да ліста ад 9 кастрычніка 1986 г.

"Беларускай хаткі". Такім чынам быў зроблены цікавы ландшафтавы акцэнт у правядзенні экскурсій, паколькі віленскі падарунак разрастаўся акурат пад акном музея.

### ТРЫМАЦЦА ПРАЎДЫ

Гаспадыня "зялёнай хаткі" даволі рана страціла слых, у пахілым веку гэта моцна ўскладняла непасрэднае камунікаванне. Быў заведзены спецыяльны сшытак, у які візіцёры запісвалі пытанні. Не можа не выклікаць захапленне і глыбокай павагі самаахвярнасць 95-гадовага чалавека, які імкнуўся ўсім даць пісьмовы адказ: «*Апошні час чуюся слаба і дрэнна… Баліць галава, ногі, дакучае страўнік. Усе мае "часткі" цела знішчыліся, знасіліся… А нават нічога ня уставіш – не машына… Стараюся трымацца праз сілу – але гэта не заўсёды удаецца… Часта і ўставаць ня хочацца. Ні ўставаць ані думаць…*» (с. 78–79).

Адрасантка імкнулася не абыйсці ўвагай нікога з зацікаўленых. Праз багдановічазнаўцаў прасіла перадаць вестку супрацоўніцы Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры: "*Можа, у Вас ёсьць тэлефон Ларысы Сагановіч? Папрасіце, нехай ня крыўдзіцца, што не адказываю на ліст… Пісаць цяжка. Ці дачакаю верасьня і Генадзя Сагановіча у сябе ня ведаю. Але для Яе Музэя што небудзь астаулю*" (с. 82). Пачуўшы ў 1986 г. вестку ад Янкі Саламевіча пра падрыхтоўку багдановічаўскай энцыклапедыі, Л. Войцік пачала падбіраць матэрыялы для будучага выдання.

Сціслыя аповеды насычаны жывымі эмоцыямі, звязанымі з захаваннем памяці пра Максіма Багдановіча, а таксама факталагічнымі скажэннямі ў бачанні мінуўшчыны, згледжанымі ў некаторых публікацыях: "*…як-бы ні было, трэба трымацца праўды*" (с. 843). З лістоў вынікае, што не згладзіліся ў памяці, напрыклад, крыўда на Рамуальда Зямкевіча (падвёў з пазыкай строяў для дзіцячай пастаноўкі ў Ратамцы). Людвіка Войцік адкрыта-варожа ставілася да ўспамінаў "Страцім-лебедзь" Змітрака Бядулі, крытычна ацэньвала "Развітанне" Барыса Мікуліча, прозу Леаніда Зубарава і некаторыя даследаванні Адама Мальдзіса. Разам з тым адрасантка з цеплынёй згадвала шэраг закрэсленых або папросту забытых на час перапіскі імёнаў (Аляксандр Уласаў, Усевалад Фальскі, Аркадзь Смоліч, Лявон Заяц і інш.); захаплялася "Хмарамі над бухтай" Алеся Бачылы; ускладала вялікія надзеі на прадстаўнікоў маладога пакалення, хацела асабіста пазнаёміцца з Алесем Асташонкам і г. д. Многія катэгарычныя выказванні можна палічыць спрэчнымі, суб'ектыўнымі. Вядома, эмоцыя не аб'ектывізуе малюнак, але валодае прыцягальнай сілай жывой пульсацыі мінулага, заклікае да палемікі, хоць і завочна-надчасавай.

Пасля знаёмства з лістамі застаецца толькі шкадаваць, што адрасантка далёка не ўсё лічыла патрэбным перадаць з Літвы ў Беларусь, нават у капійным варыянце. Так, з лістоў Ванды Лявіцкай (дачка пісьменніка Ядвігіна Ш., знаёмая з М. Багдановічам па перапісцы яшчэ да яго прыезду ў Мінск) яна прыводзіла толькі вытрымкі, датычныя паэта. У прыватным зборы Л. Войцік толькі лістоў было больш за 6 тыс., а яшчэ фотаздымкі, іншыя каштоўныя матэрыялы. У той час даследчыкі жыцця і творчасці Максіма Багдановіча яшчэ толькі акрэслівалі агульныя шляхі пошуку, узнаўлення і музеефікацыі найбольш важных вехаў, пры гэтым змушана абміналі табуяваныя ў савецкі час імёны і падзеі, абсалютна не факультатыўныя ў гісторыі беларускай культурна-асветніцкай дзейнасці. Пры нашай сённяшняй цікавасці да гісторыі паўсядзённасці ўсе гэтыя матэрыялы былі б надзвычай запатрабаванымі. На жаль, "зялёная хатка" згарэла, архіўныя скарбы страчаны.

У 2013–2015 гг. выйшлі тры кнігі ўспамінаў, лістоў, выбраных твораў Зоські Верас. Думаецца, "Архіўныя матэрыялы да жыцця і творчасці Максіма Багдановіча. Сшытак 5" (2022) зоймуць належнае месца сярод гэтых выданняў, прыцягнуць увагу даследчыкаў. Перад чытачамі класік беларускай літаратуры паўстане ў нечаканых дэталях, фарбах і эмоцыях. Ліставанне не толькі ўзнаўляла далёкае мінулае, яно стала беспрэцэдэнтнай фіксацыяй паэтапнай працы па стварэнні музеяў паэта ў Мінску і Гродне.

*Ілюстрацыйны матэрыял з фондаў Літаратурнага музея Максіма Багдановіча.*